ніхто не пачуе,
аніхто ў свеце
не ўбачыць
Маіх патаемных
крокаў.
Я адарвуся ад паперы.
У змроку...

## Вольга Шунейка

### Крышталёвая раніца

Я бягу па вясновай вуліцы. Сонечныя промні бягуць услед. Раніца спявае свежым ветрам.

Адчуванне велічы жыцця і падзеленага на дваіх, як тады, шчасця.

“Я падару табе гэтыя аблокі...” Ах, якія тады былі аблокі!.. На блакітным-блакітным небе павольна праплывалі рэдкія бела-ружовыя аблачынкі, такія лёгкія, што, здаецца, ціхенька падзьмеш – і яны хутка-хутка знікнуць.

Крышталёвая раніца...

Як парою хочацца небанальна, нетрывіяльна выказаць свае пачуцці! Але што ёсць больш банальнае і звычайнае за ўсход ці захад сонца, і ў той жа час больш прыгожае і рамантычнае?!

“Я як на арэлях...”

Арэлі гайдаюцца то ўверх, то ўніз, і я разам з табою на гэтых арэлях. І я таксама адчуваю і радасць, і страх: хораша разам, ды раптам яны абарвуцца? Узнёсласць і захапленне ад усяго: ад сонца і раніцы, ад лета і подыху ветру, і ад таго, што ты побач...

Я бягу па вясновай вуліцы. Сонечныя промні бягуць услед. Хочацца гарэзіць, як дзіця, адначасова скакаць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крычаць, плакаць, смяяцца і быць шчасліваю думкай, што Ён ёсць, Ён думае пра цябе...

***

Зорная ростань
Як частка спаткання.
Гэта пачатак
Майго раставання,

Майго раставання
З табою,
З душою.
Свечка гарыць
Як частка спакою,

Частка спакою
У сэрцы,
У думках.
Толькі ці трэба
Спакой – паратунак?

***

Вы паўсталі на маім шляху
У зорны ціхі вечар,
Як густы водар чабору
Ў летнюю спёку
У старым закінутым садзе.
І я ведаю, што мне
Не абмінуць Вас,
Ніяк не сасгупіць убок
З вузкай сцежкі.
Гэта як мроіва,
Як тое, што абавязкова адбудзецца,
Тое, што наканавана...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я гляджу ў Вашыя нябёсныя,
Бяздонныя, як вір, вочы –
І адчуваю:
Што ніяк не магу вынырнуць,
Каб ўратавацца...
Але гэта і ёсць шчасце...
Усеабдымнае, неабсяжнае
Шчасце!

***

Тваё пачуццё –
як на арэлях:
Уверх – каханне,
уніз – як у хмелі.

Тваё каханне –
як снег у спёку.
Не разбяруся
з сабой я покуль.

Ты ўвесь вясновы,
святлей за промні,
Як тое слова:
"Кахаю!" – помніш?

***

Верасовым водарам
пахлі Вашыя вусны,
калі я нясмела,
баючыся, дакранулася
да іх сваімі вуснамі.
Гэта было адно імгненне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адно-адзінае малюсенькае
імгненне даўжынёю ў стагоддзі.
І гэты пацалунак
адбіўся ў маёй душы
апёкам чацвёртай ступені,
як сказала паэтка.
А потым Вы зніклі,
як у небе паветраны шар,
як смак марожанага ў летнюю спеку,
як адчуванне свята на наступны дзень.
І няхай больш нічога
не будзе:
ні сустрэч вясновым вечарам,
ні патаемных пацалункаў у пад'ездзе,
ні лёгкага выпадковага дакранання
рукамі... Няхай...
Я ўсё роўна буду помніць
Вас.
Як Натхненне. Як Радасць. Як Палёт.

***

Пячатка зноў лягла на сэрца,
Бы кобнік склаў замову тут.
І мушу я забыць да смерці
І родны дом, і родны кут.

Нічога карта не пакажа –
Чужое стала дарагім.
Бабуля-знахарка мне скажа:
"Пячаць на сэрцайку тваім!"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хто ўсім нам сэрцы запячатаў?
Калі наш сум навекі пройдзе?
Загналі мы душу за краты.
А дзе ўсё ж сябе мы знойдзем?..

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ